# Цырымонія перадачы ў дар выдання “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”



25.02.2016

24 лютага 2016 года ў рамках падрыхтоўкі да святкавання ў 2017 годзе 500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання ў зале адукацыйных тэхналогій Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася цырымонія перадачы ў дар прадстаўнікам дыпламатычных місій выдання “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”.

У цырымоніі прынялі ўдзел прадстаўнікі дыпламатычных місій Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Італьянскай Рэспублікі, Літоўскай Рэспублікі, Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Польшча, Украіны, Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, а таксама Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і спонсара выдання – банка БелВЭБ.

Удзельнікаў цырымоніі прывітаў Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Б.У.Святлоў, з прамовай выступіў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С.Матульскі. У ходзе гутаркі ўдзельнікі абмеркавалі арганізацыю ў 2017 годзе буйнога сумеснага выставачнага праекту, прысвечанага гісторыі кнігадрукавання.

Прадстаўнікам дыпламатычных місій ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўручаны камплекты з 11 кніг факсімільнага выдання “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”.